**ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ**
**па правядзенні выбараў**
**у Каардынацыйную Раду ІІІ склікання**

# РАШЭННЕ

**аб адмене ў рэгістрацыі спіса кандыдатаў выбарчага суб’екта для ўдзелу ў выбарах у Каардынацыйную раду**

**24 траўня 2024 года** **г. Варшава**
**№ 24/05/24-1**

Выбарчая камісія па правядзенні выбараў у Каардынацыйную раду ІІІ склікання (далей - Выбарчая камісія) ў асобах Алены Прыходзька (старшыні), Андрэя Атаманчука, Яраслава Бекіша, Дзмітрыя Лазавіка, Альвіны Мінгазавай і Алены Філатавай, разглядзеўшы па ўласнай ініцыятыве пытанне аб магчымасці далейшага ўдзелу ў выбарчым працэсе выбарчага суб’екта “Закон і правапарадак”,

## ВЫЗНАЧЫЛА:

У перыяд з 21 па 22 траўня 2024 года была ажыццяўлена агітацыйная рассылка праз чат-бот “План “Перамога”. Змест паведамлення наступны: “*Паважаныя Беларусы! Заклікаем Вас прыняць удзел у выбарах у Каардынацыйную Раду з 25 па 23:59 27 мая. Прагаласаваць можна бяспечна па спасылцы на афіцыйных рэсурсах Каардынацыйнай Рады. Галасуйце за вашых прадстаўнікоў “ЗАКОН І ПРАВАПАРАДК”. СПІС №5*”.

Дадзеныя абставіны пацвярджаюцца шэрагам звестак: публікацыямі СМІ, зваротамі грамадзян на адрас Выбарчай камісіі са скаргамі на дзеянні Аляксандра Азарава з прычыны атрымання рассылкі, а таксама непасрэднага выяўлення рассылкі сябрамі Выбарчай камісіі на сваіх уласных прыладах.

Па выніку зваротаў да Аляксандра Азарава, спецыялістаў у сферы лічбавай бяспекі, Выбарча камісія прыходзіць да наступных высноваў.

1. Рассылка паведамленняў агітацыйнага характару ў бок падпісчыкаў чат-бота “План “Перамога” без іх дазволу на атрыманне адпаведнай рэкламнай рассылкі парушае патрабаванні Агульнага Рэгламент аб ахове дадзеных у краінах Еўрапейскага Саюза (GDPR), у тым ліку артыкулаў 5, 7. Сам Аляксандр Азараў патлумачыў, што хацеў прыцягнуць увагу да выбараў, паколькі палічыў недастатковым асвятленне выбараў у СМІ. Тым самым Аляксандр Азараў фактычна ажыццявіў рассылку інфармацыі рэкламнага характару, на што не давалі дазволу падпісчыкі чат-бота а таксама асобы, якія адпісаліся ад чат-бот (выдалілі яго), але, тым не менш, атрымалі паведамленне.

У адпаведнасці з Мемарандум аб прынцыпах і правілах удзелу ў выбарчай кампаніі ў Каардынацыйную раду Беларусі (далей – Мемарандум) кандыдаты павінны выконваць правілы Этычнага Кодэкса Каардынацыйнай рады (далей – ЭККР). У прыватнасці, згодна з пп. 1.2.3 пункта 1 неабходна кіравацца агульна прынятымі нормамі права і выконваць законы той краіны, дзе знаходзяцца, акрамя выпадкаў праявы грамадзянскага непадпарадкавання ва ўмовах барацьбы за дэмакратыю і правы чалавека.

На гэтай падставе Выбарчая камісіі лічыць дзеянні Аляксандра Азарава, якія праявіліся ў парушэнні GDPR, неправамернымі і неэтычнымі.

2. Зыходзячы з пункта 1, Выбарчая камісія лічыць таксама неэтычным выкарыстанне чат-бота “План “Перамога”: у грамадскасці сфармавалася ўстойлівае ўяўленне пра “План Перамога”, што ён распрацаваны выключна для мэтаў узнаўлення законнасці ў Беларусі шляхам актыўных скаардынаваных дзеянняў (у тым ліку сілавых), скіраваных супраць рэжыму ўнутры краіны. Дзеля гэтых мэтаў людзі былі гатовыя ісці на рызыку страты жыцця і свабоды. Правядзенне выбараў у Каардынацыйную раду не з’яўляецца той актыўнасцю, дзеля якой грамадзяне ішлі на рызыку, падпісваючыся на чат-бот.

У гэтых дзеяннях Аляксандра Азарава Выбарчая камісія бачыць падман падпісчыкаў чат-бота і кваліфікуе іх як парушэнне этычных нормаў падчас правядзення агітацыі, выкананне якіх патрабуе Мемарандум.

3. Рассылка, якая была здзейснена Аляксандрам Азаравым, па меркаванні Выбарчай камісіі з’яўляецца небяспечнай для беларускіх грамадзян, асабліва тых, хто знаходзіцца ўнутры краіны.

На дадзены час Выбарчая камісія не валодае праверанымі звесткамі пра наступствы такой рассылкі ў выглядзе адвольных затрыманняў і інкрымінавання злачынстваў. Тым не менш, мадэлюючы сітуацыі, пры якіх грамадзяне маглі стаць атрымальнікам рассылкі, угледжваюцца наступныя небяспечныя акалічнасці: ў выпадку знаходжання асобы ва ўладзе рэпрэсіўных органаў, атрыманне рассылкі з высокай верагоднасцю становіцца падставай для крымінальнага пераследу, напрыклад: чалавек затрыманы па адміністрацыйным або крымінальным артыкуле і ягоны тэлефон на працягу некалькіх месяцаў знаходзіцца ў распараджэнні рэпрэсіўных органаў (якім вядомы пароль ад тэлеграм-акаўнта); чалавек, які адбывае пакаранне ў выглядзе абмежавання свабоды з накіраваннем у папраўчую установу адкрытага тыпу (хімія), атрымлівае паведамленне і ад яго патрабуе начальства паказаць тэлефон; і інш.

Выбарчая камісія не атрымала пераканаўчых адказаў ад Аляксандра Азарава наконт таго, якім чынам ён паклапаціўся пра бяспеку падпісчыкаў чат-бота. Разам з тым, згодна з Палажэннем, аб правядзенні выбараў у Каардынацыйную раду ад 31 сакавіка 2024 года (далей - Палажэнне) прыярытэтам выбарчай кампаніі з’яўляецца **бяспека ўдзельнікаў выбарчага**

**працэсу на тэрыторыі Беларусі. У адпаведнасці з Мемарандумам** кожны кандыдат абавязуецца **выконваць усе неабходныя меры бяспекі і абароны інтарэсаў удзельнікаў кампаніі і грамадзян Беларусі.**

Адпаведна, Выбарчая камісія прыходзіць да высновы аб парушэнні Аляксандрам Азаравым патрабавання Мемарандума аб неабходнасці выканання мер бяспекі і абароны інтарэсаў грамадзян Беларусі.

4. Згодна з пп. 3.1 пункта 3 Палажэння ўдзельнікамі выбараў з'яўляюцца выбарчыя суб'екты. Выбарчым суб'ектам могуць быць палітычныя партыі, устаноўчыя камітэты партый, арганізацыі грамадзянскай супольнасці, фракцыі Каардынацыйнай рады другога склада, іх кааліцыі, ці групы грамадзян, **якія аб'ядналіся для ўдзелу ў выбарах, якія адпавядаюць патрабаванням гэтага Палажэння**.

У адпаведнасці з пп. 3.2.5 пункта 3 Выбарчая камісія патрабаваннем да выбарчых суб'ектаў з'яўляецца **пісьмовая згода ўсіх кандыдатаў спіса з палажэннямі Мемарандума аб прынцыпах і правілах удзелу ў выбарчай кампаніі**.

Паводле нормаў Мемарандума кожны кандыдат павінен **выконваць этычныя нормы падчас правядзення агітацыі, у тым ліку правілы Этычнага Кодэкса Каардынацыйная рады**, а таксама **выконваць усе неабходныя меры бяспекі і абароны інтарэсаў грамадзян Беларусі**.

З вышэй выкладзенага вынікае, што Аляксандр Азараў не выконвае патрабаванні Мемарандума. Пры гэтым, зыходзячы з пп. 3.1 пункта 3 Палажэння, суб'ектамі выбараў з'яўляюцца не асобныя кандыдаты, а спіс кандыдатаў (выбарчы суб'ект). З гэтай прычыны, кіруючыся паўнамоцтвамі, прадугледжанымі пп. 4.9.2 пункта 4 Палажэння, Выбарчая камісія прыходзіць да высновы аб неабходнасці адмены рэгістрацыі выбарчага суб'екта "Закон і правапарадак" на падставе пп. 7.2 пункта 7 Палажэння: ў выпадку, калі не выконваюцца патрабаванні Палажэння да спіса кандыдатаў, рашэнне аб рэгістрацыі выбарчага суб'екта адмяняецца.

5. 24 траўня 2024 года ў 08:38 (CET) у Выбарчую камісію паступіў зварот ад лідара выбарчаа суб'екта "Закон і правапарадак" Аляксандра Азарава, у якім змяшчаецца наступнае: "*Команда «Закон и правопорядок» провела совещание и большинством голосов приняла решение ПОДДЕРЖАТЬ Александра Азарова и оставить его в списке»*. Дадзенае паведамленне Выбарчая камісія вызначае як пазіцыю выбарчага суб'екта, якая сведчыць аб нязгодзе выконваць Палажэнне ў дачыненні да патрабаванняў бяспекі і этычных паводзінаў падчас агітацыі.

Такім чынам, кіруючыся пп. 4.9.2 пункта 4, Выбарчай камісіяй

**ВЫРАШАНА:**

Рашэнне аб рэгістрацыі выбарчага суб’екта і спіса кандыдатаў для ўдзелу ў выбарах у Каардынацыйную раду ад 20 красавіка 2024 года № 24/04/20-1 – адмяніць.

Унесці ў Пастанову аб зацвярджэнні спісаў выбарчых суб’ектаў ад 25 красавіка 2024 года наступныя змены: спіс кандыдатаў выбарчага суб'екта "Закон і правапарадак" – выключыць.

Старшыня Выбарчай камісіі А. Прыходзька